www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

15 чэрвеня 2007 года, № 12 (1963)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ПАРАЗУМЕЛІСЯ НА СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ



Рэктары БДУ і ГрДУ Васіль Стражаў і Яўген Роўба падчас падпісання пагаднення

***Дамова аб супрацоўніцтве ў галіне інфарматызацыі вучэбнага працэсу паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы падпісана 7 чэрвеня ў БДУ.***

Яна прадугледжвае сумесную дзейнасць па распрацоўцы і ўкараненні агульных падыходаў, методык і сродкаў інфарматызацыі вучэбнага працэсу; уніфікацыі і выкарыстанні адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў і сродкаў доступу да іх; стварэнні сістэмы павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў у галіне выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій у вучэбным працэсе.

Сярод асноўных напрамкаў сумеснай дзейнасці – удасканаленне зместу вучэбнага працэсу з арыентацыяй на шырокае ўкараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій пры падрыхтоўцы спецыялістаў прыродазнаўчага, тэхнічнага і гуманітарнага профіляў; арганізацыя сумесных навукова-даследчых работ; забеспячэнне ўдзелу двух універсітэтаў у міжуніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных навуковых праграмах у галіне інфарматызацыі; прасоўванне створаных у гэтай вобласці распрацовак і праграмных сродкаў на ўнутраным і міжнародным рынках; развіццё сістэмы камп'ютарных камунікацый у сферы адукацыі і навукі з мэтай забеспячэння доступу да інфармацыйных рэсурсаў глабальных камп'ютарных сетак, эфектыўнага выкарыстання створаных у рэспубліцы інфармацыйных рэсурсаў, інтэграцыі беларускіх ВНУ ў сусветную сістэму адукацыі і навукі; практычнае ўкараненне адзінай агульнауніверсітэцкай спецыялізаванай камп'ютарнай сістэмы падтрымкі інфармацыйнага забеспячэння самастойнай работы студэнтаў – e-University, распрацаванай у БДУ сумесна са спецыялістамі Міжнароднага дзелавога альянсу IBA і інш.

Дамова была заключана на невызначаны тэрмін у рамках дзеючага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж дзвюма ВНУ.

**Дзмітрый ГОРСКІ**

**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Парадак прыёму ў магістратуру Беларускага дзяржаўнага універсітэта на 2007 год

Стар. 3

Беларускі дзяржаўны універсітэт аб'яўляе прыём у аспірантуру на 2007 год

Стар. 4

КАНФЕРЭНЦЫІ

## ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ – НА СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Назва Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Кіраванне якасцю вышэйшай адукацыі ва ўмовах пераходу да дзвюхступенчатай сістэмы падрыхтоўкі кадраў", якая прайшла 6–7 чэрвеня ў БДУ, гаворыць сама за сябе. Вядома, што якасць вышэйшай адукацыі забяспечваецца, з аднаго боку, удасканаленнем адукацыйнай сістэмы, якая ўжо існуе, а з другога – распрацоўкай новых канцэптуальных падыходаў да яе развіцця. Таму на гэтым форуме былі разгледжаны такія актуальныя праблемы якасці вышэйшай адукацыі, як удасканаленне нарматыўна-прававога і вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу, захаванне фундаментальнасці і цэласнасці навучання, аптымізацыя модульна-рэйтынгавай і крэдытнай сістэм у вышэйшай адукацыі, а таксама формы і змест самастойнай працы студэнтаў і г. д.

Аналіз вопыту замежных краін, які быў накоплены у сферы менеджменту якасці, і паспяховае міжнароднае супрацоўніцтва таксама занялі пэўнае месца ў рабоце навуковай канферэнцыі, якая праходзіла з удзелам больш за 100 вучоных, экспертаў і спецыялістаў з ВНУ Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Іспаніі, Італіі, Германіі, Польшчы, Балгарыі.

Да ўсяго, былі разгледжаны вынікі міжнароднага праекта ТЭМПУС "Пераўтварэнне вучэбнага працэсу ў БДУ на аснове ECTS-сумяшчальных тэхналогій", удзельнікамі якога, акрамя нашага універсітэта, былі Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна, нямецкія універсітэты Магдэрбурга, Йены, Каселя, Білефельда, Франкфурта-на-Одэры, а таксама універсітэт Малага (Іспанія), універсітэт Трэнта (Італія).

На канферэнцыі прагучала 95 дакладаў. Дарэчы, усе матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі надрукаваны ў адпаведным зборніку. Да таго ж пры фінансавай падтрымцы праекта ТЭМПУС наш універсітэт змог распрацаваць і надрукаваць інфармацыйныя пакеты на рускай і англійскай мовах і каталогі модуляў па сацыялогіі, гісторыі, камп'ютарнай матэматыцы, эканоміцы, якія прайшлі экспертызу ў еўрапейскіх універсітэтах. Усе гэтыя матэрыялы атрымалі ўдзельнікі форуму.

**Ганна ЛАГУН**

АНОНС

## ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

***Эфектыўнасць работы аспірантуры будзе абмеркавана на пасяджэнні Вучонага савета БДУ 18 чэрвеня. З дакладам на гэту тэму выступіць начальнік упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі Канстанцін Каросцік.***

Акрамя таго, члены Вучонага савета разгледзяць пытанне аб наданні звання "Ганаровы прафесар БДУ" міністру замежных спраў Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Нкасазане Дламіні-Зума.

Нкасазана Дламіні-Зума – першая жанчына ў гісторыі ПАР, якая заняла пасаду міністра замежных спраў. Пад яе кіраўніцтвам знешнепалітычнае ведамства праводзіць актыўную палітыку, вызначаную маштабнасцю, паслядоўнасцю і прагматызмам. Такі падыход вылучыў ПАР на ролю рэгіянальнага лідара, без якога не абыходзіцца вырашэнне асноўных праблем Афрыкі.

Нкасазане Дламіні-Зума нададзены ганаровыя званні доктара юрыдычных навук Натальскага і Брыстольскага універсітэтаў, доктара медыцыны Транскейскага універсітэта. Яна мае прэміі і ўзнагароды Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, Яўрэйскай Жаночай арганізацыі, Міжнароднага Жаночага Форуму "Жанчынам, якія пераўтвараюць свет", Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі "Паўднёваафрыканская дэкада пераможнага кіраўніцтва" (ганаруюцца выбітныя чарнаскурыя бізнесмены і дзяржаўныя дзеячы), а таксама Афрыканскага Саюза. Н. Дламіні-Зума 11 ліпеня 2005 г. была ўзнагароджана ордэнам Пятра Вялікага I ступені.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

ЮБІЛЕІ

## ЗНАЎЦА РОДНАЙ МОВЫ

***10 чэрвеня споўнілася 80 гадоў Веры Барысаўне Хацкевіч.***

У 1947 г. пасля заканчэння Барысаўскага педвучылішча Вера Хацкевіч паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1956 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю.

З 1947 г. і па сёння Вера Барысаўна вядзе вялікую навукова-педагагічную работу. Як выкладчык БДУ яна выхоўвала ў студэнтах любоў да Радзімы, да роднага беларускага слова. У навуковых працах па вывучэнні жывой беларускай мовы Вера Хацкевіч заўсёды абапіралася на матэрыялы з народнага жыцця.

Яе дзеці і ўнукі – вядомыя ў рэспубліцы мастакі: сын Юрый Піскун, яго жонка Алена Юр'ева і тры ўнучкі – Валянціна, Зося і Вольга.

*Віншуем з юбілеем!*

ПАДЗЕІ

## ВІЗІТ У БДУ ЯК УЗНАГАРОДА

Пераможцы 13-й алімпіяды па беларускай мове, якая штогод праходзіць у Польшчы, сталі гасцямі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 14 чэрвеня адбылася іх сустрэча з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым. Госці наведалі філалагічны факультэт, музеі Белдзяржуніверсітэта, пабывалі ў тэатры, Нацыянальнай бібліятэцы. Для іх былі арганізаваны экскурсіі па Мінску, а таксама ў музейны комплекс "Дудуткі".

Гэты візіт – падарунак пераможцам алімпіяды, які юнакі і дзяўчаты атрымоўваюць ужо другі год запар. Арганізавалі яго кафедра беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, пасольства нашай краіны ў Польшчы і таварыства дружбы "Беларусь–Польшча".

Дарэчы, алімпіяда па беларускай мове адбываецца ў Польшчы пад патранажам Польскага інстытута ў Мінску, пасольства Польшчы ў Беларусі і пры ўдзеле кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта.

**Марыя АКУЛІК**

## ДЫЯМЕНТЫ І БРЫЛЬЯНТЫ АД "АДАМАС БДУ"

Выстава "Дыяменты і брыльянты", дзе будзе прадстаўлена прадукцыя Навукова-вытворчага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Адамас БДУ", адбудзецца 18 і 19 чэрвеня ў холе 1-га паверха будынка рэктарата з 10.00 па 16.00.

Мэта акцыі – інфармаванне студэнтаў і супрацоўнікаў аб дзейнасці інавацыйных прадпрыемстваў БДУ, папулярызацыя і прасоўванне на рынак прадукцыі прадпрыемства "Адамас БДУ". Наведвальнікі выставы маюць магчымасць не толькі ўбачыць, але і набыць па выгадным кошце дыяменты і брыльянты, якія ні ў чым не саступаюць прыродным.

У ПРАФКАМЕ

# ПРАЦОЎНЫЯ АДНОСІНЫ АДРЭГУЛЯВАНЫ ДА 2010 ГОДА

***На канферэнцыі працоўнага калектыву БДУ, якая прайшла 7 чэрвеня, было разгледжана два вельмі важных пытанні для жыцця нашага універсітэта: выкананне калектыўнай дамовы за 2004–2007 гг. паміж наймальнікам у асобе рэктара БДУ і работнікамі ў асобе старшыні прафкама і падпісанне такога ж дакумента на 2007–2010 гг. Дарэчы, праект дамовы прадстаўлены ў сетцы "Інтранэт" для шырокага кола чытачоў.***

Па словах старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў БДУ Яўгена Туромшы, калектыўная дамова на 2007–2010 гг. будзе кардынальна адрозніваца ад папярэдняй. Звязана гэта з тым, што змест дакумента вызначаецца бакамі ў адпаведнасці з генеральным, тарыфным і мясцовымі пагадненнямі ў межах іх кампетэнцыі, а таксама Працоўным кодэксам. А калі ўлічыць, што і заканадаўства краіны апошнім часам значна змянілася, то становіцца зразумелым, чаму праект калектыўнай дамовы быў перапрацаваны амаль поўнасцю. Ён складаецца з 11-ці раздзелаў і 12-ці дадаткаў (141 артыкул у праекце новай калектыўнай дамовы, 138 – у старой). Па-іншаму гучаць такія раздзелы, як гарантыі занятасці, рэжым працы і адпачынку, дадатковыя льготы і гарантыі супрацоўнікам, ахова працы. І што важна, 2 дадаткі калектыўнай дамовы, якія тычацца матэрыяльнага стымулявання працы і выкарыстання фонду матэрыяльнай дапамогі універсітэта, набылі большую змястоўнасць і канкрэтную накіраванасць.

На канферэнцыі супрацоўнікаў БДУ была прынятая пастанова, у якой адзначана, што прафкам мае намер пастаянна выступаць паўнамоцным прадстаўніком усіх супрацоўнікаў БДУ ў калектыўных перамовах, у тым ліку падчас заключэння калектыўнай дамовы з адміністрацыяй універсітэта і кантролю за яе выкананнем.

**Ганна ЛАГУН**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ЗАВАЮЙ СВАЮ ПЕРАМОГУ!

***Адбылася традыцыйная віктарына, прысвечаная Дню Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Конкурс, арганізаваны ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю сумесна з гістарычным факультэтам, зацікавіў многіх удзельнікаў: студэнтаў, магістрантаў, навучэнцаў Юрыдычнага каледжа. Пераможцаў, акрамя ўсяго, чакала значная матэрыяльная ўзнагарода.***

Сярод 33-х конкурсных работ кампетэнтнае журы вылучыла найманцнейшыя, і прызавыя месцы размеркаваліся наступным чынам:

I месца – Андрэй Елісееў, студэнт V курса факультэта міжнародных адносін (41 бал) і Таццяна Пашкевіч, навучэнка II курса Юрыдычнага каледжа БДУ (40 балаў);

II месца – Андрэй Бяспальцаў, студэнт II курса факультэта радыёфізікі і электронікі (39 балаў);

III месца – Валянціна Сліжэўская, студэнтка I курса Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ (37 балаў).

Сёлетняя, чацвёртая па ліку, віктарына мела 12 пытанняў, сфармуляваных па трох праблемных блоках. Першы ўтрымліваў заданні па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны народа ў цэлым. Упершыню ў віктарыну было ўключана заданне, прысвечанае саюзнікам СССР у гады Другой сусветнай вайны – французскім лётчыкам авіяцыйнага палка "Нармандыя-Нёман". Другі блок – самы вялікі – ахопліваў барацьбу беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Трэці блок складаўся з заданняў на тэму фашысцкай акупацыйнай палітыкі на Беларусі.

Кожны адказ на пытанне, у залежнасці ад правільнасці і паўнаты, ацэньваўся ад 0 да 3-х балаў. За афармленне работ дадавалася ад 0 да 6-ці балаў. У выніку, максімальная колькасць балаў, якую мог набраць удзельнік віктарыны, – 42.

Журы адзначыла дастаткова высокі ўзровень адказаў, глыбіню пранікнення ў тую ці іншую праблему, выдатнае афармленне прызавых работ, пошук і творчасць удзельнікаў віктарыны.

Узнагароджанне пераможцаў віктарыны адбудзецца 29 чэрвеня – у Дзень памяці студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Плануецца, што найлепшыя работы будуць выстаўляцца ў Музеі гісторыі БДУ, на мерапрыемствах, прысвечаных святкаванню Дня Перамогі і Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

**Сяргей АЛЕКСАНДРОВІЧ,**
**канд. гіст. навук**
**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**

## УРАЖАННІ ПЕРАМОЖЦАЎ

**Андрэй Елісееў:** "Пра гэтую віктарыну я даведаўся з абвесткі на факультэце. Вырашыў паспрабаваць свае сілы. Падрыхтоўка заняла ў мяне 3–4 дні. Матэрыялы шукаў і ў Інтэрнэце, і ў Нацыянальнай бібліятэцы. Па праўдзе, я чакаў сваёй перамогі, бо падаў дастаткова разгорнутыя адказы на зададзеныя пытанні. Самым, напэўна, складаным для мяне было пытанне № 6, дзе патрабавалася назваць аўтара слоў: "Беларусь не можа разглядацца намі як цывілізаваная краіна. З-за вострага недахопу сілаў паўстае пытанне аб залучэнні эсэсаўскіх і паліцэйскіх сілаў для ўсталявання "новага парадку" як мага хутчэй...". У большасці крыніц нічога канкрэтнага па гэтай тэме не гаворыцца. Так што прыйшлося папацець".

**Таццяна Пашкевіч:** "У віктарыне я ўдзельнічаю другі год. Як і ў мінулы раз, пра яе я дазналася з абвесткі ў Юрыдычным каледжы БДУ. Падрыхтоўка адказаў заняла ў мяне ўвесь адведзены перыяд часу. Адказы шукала і ў Інтэрнэце, і ў розных энцыклапедыях, і ў чытальных залах бібліятэк. На прызавое месца я вельмі спадзявалася. А самым складаным і адначасова цікавым для мяне было пытанне па дзейнасці арганізацыі "Венета", паколькі інфармацыі на гэтую тэму вельмі мала".

**Андрэй Бяспальцаў:** "Я зусім не чакаў, што займу II месца. Пра віктарыну я даведаўся выпадкова ад сваякоў – супрацоўнікаў універсітэта. Рыхтаваўся ў асноўным па падручніках гісторыі для старэйшых класаў. Думаю ў будучым годзе таксама паспрабаваць свае сілы. Канешне, калі часу будзе хапаць".

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ПЕРСПЕКТЫЎНЫ КАДРАВЫ РЭЗЕРВ



З мэтай выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў лютым – маі 2007 г. на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь быў рэалізаваны праект "Школа маладога лідара". У праекце бралі ўдзел студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якія ўваходзяць у перспектыўны кадравы рэзерв: Наталля Атрашкова, факультэт міжнародных адносін; Уладзімір Бандарэнка, гістарычны факультэт; Надзея Дрыла, факультэт журналістыкі; Дзмітрый Лебедзь, гістарычны факультэт; Дзмітрый Мікулка, геаграфічны факультэт; Яўгенія Рупакова, гуманітарны факультэт. 29 мая 2007 г. удзельнікам школы далі магчымасць абараніць свае праекты, пасля чаго адбылося ўрачыстае ўручэнне сертыфікатаў удзельніка "Школы маладога лідара".

**Паводле інфармацыі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю**

ВІНШУЕМ!

# ВЫПУСКНІК БДУ – ГЭТА ГАНАРОВА

***Конкурс "Лепшы выпускнік БДУ–2007" упершыню быў праведзены сёлета па ініцыятыве ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю.***

У адрозненне ад мінулых гадоў, калі імёны такіх юнакоў і дзяўчат высвятляліся больш адвольна, цяпер на кожным факультэце былі створаны экспертныя камісіі, у склад якіх увайшлі дэканы, намеснікі дэканаў, загадчыкі кафедраў, лідары грамадскіх арганізацый. Лепшымі прызнаны 17 выпускнікоў. Пры гэтым ацэньваліся іх дасягненні не толькі ў вучобе, навуцы, але і ў культурным, спартыўным, грамадскім жыцці факультэтаў і універсітэта. Усе яны будуць узнагароджаны дыпломамі і памятнымі сувенірамі на выпускным балі 21 чэрвеня ў Ліцэі БДУ. Да ўсяго, 16 чалавек з іх ліку трапяць на Рэспубліканскі баль з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Ужо вылучаны выпускнік БДУ, што атрымае Падзяку ад самога Прэзідэнта, і два чалавекі, якія будуць узнагароджаны Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Ганна ЛАГУН**

## ЛЕПШЫЯ ВЫПУСКНІКІ БДУ ПА ВЫНІКАХ 2006-2007 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

- Ксенія Абрамава, гістарычны факультэт;
- Андрэй Андрыеўскі, факультэт радыёфізікі і электронікі;
- Вольга Бардашэвіч, геаграфічны факультэт;
- Таццяна Азёма, гуманітарны факультэт;
- Яўген Гірэйка, механіка-матэматычны факультэт;
- Юрый Голубеў, хімічны факультэт;
- Ігар Горскі, факультэт журналістыкі;
- Ганна Звездзіна, Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы;
- Віктар Малышчыц, фізічны факультэт;
- Алена Пірутко, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі;
- Аляксандр Пыталеў, факультэт міжнародных адносін;
- Ганна Русецкая, філалагічны факультэт;
- Кацярына Семеняка, факультэт філасофіі і сацыяльных навук;
- Марына Сяргей, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ;
- Аляксандр Сідаровіч, юрыдычны факультэт;
- Кацярына Скрыган, біялагічны факультэт;
- Іван Цікота, эканамічны факультэт.

# БДУ ў СМІ Беларусі

**Сустрэча міністра адукацыі Аляксандра Радзькова са студэнтамі і выкладчыкамі факультэта журналістыкі БДУ – "Народная газета" (08.06); "Звязда" (08.06).**

**Семінар у Вілейцы, прысвечаны праблемам падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі прафесіянальных кадраў для рэгіянальных СМІ, які прайшоў з удзелам выкладчыкаў журфака БДУ – "Знамя юности" (07.06).**

**Артыкул дэкана эканамічнага факультэта Міхаіла Кавалёва пра мадэлі эканамічнага развіцця Беларусі і Расіі – "Народная газета" (07.06).**

**Аб стварэнні ў БДУ стаянкі для веласіпедаў – "Экспресс-новости" (07.06); "Комсомольская правда в Белоруссии" (05.06).**

**Перамога навучэнца Ліцэя БДУ Яўгена Мядзведзева ў тэлевізійнай расійскай перадачы "Умники и умницы" – "Комсомольская правда в Белоруссии" (05.06); tut.by (05.06).**

**Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Кіраванне якасцю вышэйшай адукацыі ва ўмовах пераходу да дзвюхступенчатай падрыхтоўкі кадраў" – БелТА (04.06); naviny.by (06.06); БелАПАН (06.06).**

**Аб навучанні па праграмме МВА БДУ – "Белгазета" (04.06); tut.by (31.05).**

**Інтэрв'ю з дырэктарам Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі БДУ Любоўю Шумскай – "Знамя юности" (01.06).**

**Інтэрв'ю з дырэктарам НДІ ФХП БДУ Алегам Івашкевічам – "Настаўніцкая газета" (02.06).**

**Інтэрв'ю з дацэнтам кафедры фізвыхавання БДУ, алімпійскім чэмпіёнам па грэка-рымскай барацьбе Камандарам Маджыдавым – "Минский курьер" (02.06).**

**Акцыя студэнтаў эканамічнага факультэта БДУ для выхаванцаў сталічнай школы-інтэрната № 5 – "Вечерний Минск" (01.06).**

**Перамога пяцікурсніцы ФМА БДУ Настассі Сямашка на адборачным туры VI Міжнароднага конкурсу па кітайскай мове – БелТА (30.05); "The Minsk Times" (08.06).**

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АФІЦЫЙНА

# ПАРАДАК ПРЫЁМУ Ў МАГІСТРАТУРУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА НА 2007 ГОД

1. Парадак прыёму ў магістратуру БДУ вызначаны ў адпаведнасці з Правіламі прыёму ў магістратуру вышэйшых навучальных устаноў у 2007 годзе, зацверджанымі загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.05.2006 г. № 344.

2. Для арганізацыі прыёму ў магістратуру ствараецца прыёмная камісія пад старшынствам рэктара. У склад прыёмнай камісіі ўваходзяць прарэктары па вучэбнай рабоце, дэканы факультэтаў, начальнік Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы, адказны сакратар.

3. Прыём у магістратуру праводзіцца па спецыяльнасцях у адпаведнасці з Пералікам спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі другой ступені (магістратуры) (загад Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 29.06.2006 г. № 416) на конкурснай аснове з ліку асоб, якія атрымалі вышэйшую адукацыю першай ступені і маюць схільнасць да навуковых даследаванняў, што пацвярджаецца навуковымі публікацыямі, удзелам у распрацоўцы навукова-даследчых тэм і інавацыйных праектаў, у навукова-практычных канферэнцыях, семінарах ці іншымі матэрыяламі.

4. Асобы, якія паступаюць у магістратуру, здаюць уступны іспыт па спецыяльнасці. Уступны іспыт праводзіцца па праграмах для тых, хто паступае ў магістратуру, складзеных у адпаведнасці з тыповымі праграмамі ВНУ па спецыяльнасцях вышэйшай адукацыі і зацверджаных рэктарам БДУ. Форма правядзення ўступных іспытаў вызначаецца БДУ.

5. Прыём уступных іспытаў ажыццяўляецца экзаменацыйнымі камісіямі ў складзе не меней трох чалавек, зацверджанымі рэктарам. Ацэнка ведаў тых, хто паступае ў магістратуру, праводзіцца па дзесяцібальнай шкале (ад 1-га да 10-ці балаў).

Пераздача ўступных іспытаў не дапускаецца.

6. У выпадку нязгоды з выстаўленай адзнакай, асоба, якая паступае ў магістратуру, можа падаць старшыні апеляцыйнай камісіі ў дзень здачы ўступнага іспыту пісьмовую заяву аб пераглядзе вынікаў здачы ўступнага іспыту. Разгляд апеляцыі праводзіцца не пазней наступнага дня пасля яе падачы ў прысутнасці таго, хто паступае ў аспірантуру, і экзаменатараў, якія прымалі дадзены іспыт.

7. Асобы, якія не з'явіліся на уступны іспыт без уважлівых прычын, атрымалі адзнакі "адзін", "два" ці "тры", а таксама забралі дакументы, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца.

8. Асобам, якія сталі лаўрэатамі праведзенага Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь, іншых рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў навуковых работ па вызначанай дысцыпліне ў навучальным годзе, які папярэднічае году паступлення ў магістратуру, у выпадку яе адпаведнасці спецыяльнай дысцыпліне ўступнага іспыту па спецыяльнасці, залічваецца вышэйшы бал.

9. Па выніках уступных іспытаў прыёмная камісія прымае рашэнне аб залічэнні ў магістратуру.

Пераважным правам залічэння пры аднолькавым бале па выніках уступных іспытаў па спецыяльнасці карыстаюцца (у парадку пераліччэння):

- асобы, якія з'яўляюцца лаўрэатамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў і Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, што атрымалі пералічаныя званні ў перыяд набыцця вышэйшай адукацыі першай ступені;
- асобы, якія атрымалі па заканчэнні першай ступені вышэйшай адукацыі дыплом з адзнакай;
- асобы, якія прадставілі матэрыялы, пералічаныя ў пункце 3.

10. Агульная колькасць месцаў для прыёму ў магістратуру на бюджэтнае навучанне вызначаецца кантрольнымі лічбамі прыёму, якія ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Колькасць бюджэтных месцаў па спецыяльнасці зацвярджаецца загадам рэктара.

11. На платнае навучанне (па дамовах з фізічнымі ці юрыдычнымі асобамі) у магістратуру прымаюцца асобы, якія паспяхова вытрымалі ўступныя іспыты (атрыманая адзнака на іспыце не ніжэйшая за "чатыры"), але не прайшлі па конкурсе на бюджэтныя месцы.

Памер аплаты залежыць ад спецыяльнасці, формы навучання і вызначаецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

12. Асобы з ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія паступаюць у магістратуру, падаюць наступныя дакументы:

- заяву на імя рэктара ўстаноўленай формы (на бланку);
- копію дыплома аб вышэйшай адукацыі, завераную прыёмнай камісіяй (арыгінал дыплома прад'яўляецца);
- копію дадатку да дыплома аб вышэйшай адукацыі, завераную прыёмнай камісіяй;
- выпіску з пратакола пасяджэння Савета факультэта ВНУ аб рэкамендацыі для навучання ў магістратуры (для выпускнікоў 2007 г.);
- копію працоўнай кніжкі – для тых, хто працуе (для асоб, што знаходзяцца на ўліку ў службе занятасці насельніцтва, – адпаведную даведку);
- медыцынскую даведку па форме, зацверджанай Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь для тых, хто паступае ў ВНУ;
- 2 фатаграфіі памерам 3х4 см;
- ксеракопію пашпарта (с. 31, 33, прапіска);
- пашпарт прад'яўляецца асабіста.

Пры наяўнасці таксама падаюцца дыпломы лаўрэатаў міжнародных студэнцкіх алімпіяд і рэспубліканскіх (абласных) конкурсаў студэнцкіх навуковых работ, спіс і копіі апублікаваных навуковых работ, апісанняў вынаходніцтваў, справаздачы аб выкананых даследаваннях і распрацоўках і іншыя матэрыялы.

13. Дакументы ад тых, хто паступае ў магістратуру, прымаюцца з 27 чэрвеня па 5 ліпеня прыёмнымі камісіямі адпаведных факультэтаў.

Уступны іспыт па спецыяльнасці праводзіцца 6 ліпеня. Залічэнне на бюджэтную форму навучання – да 9 ліпеня, на платную – да 11 ліпеня.

Пачатак навучальнага года – 1 верасня.

14. Тэрмін навучання ў магістратуры для выпускнікоў ВНУ Рэспублікі Беларусь складае 1 год на дзённай форме навучання, 1,5 гады – на завочнай.

15. Асобам, якія не прайшлі па конкурсе, асабіста пад распіску вяртаюцца арыгіналы і копіі дакументаў, пададзеных у прыёмную камісію (акрамя заявы).

16. Іншыя пытанні, звязаныя з прыёмам у магістратуру, канчаткова рашаюцца БДУ ў адпаведнасці з заканадаўствам.

17. Прыём у магістратуру замежных грамадзян праводзіцца ў адпаведнасці з пунктамі 4, 5 і 10 Правіл прыёму ў магістратуру вышэйшых навучальных устаноў, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

АБ'ЯВЫ

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ" ЗАПРАШАЕ НА ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ Ў ВЕРАСНІ–СНЕЖНІ 2007 Г. ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СПЕЦЫЯЛІСТАЎ УСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ПА НАСТУПНЫХ НАПРАМКАХ:

| | |
|---|---|
| Мова як сродак міжкультурнай камунікацыі і палікультурнай адукацыі сучаснага спецыяліста (для выкладчыкаў рускай мовы як замежнай і спецыялістаў па рабоце з замежнымі студэнтамі) | 03.09–14.09 |
| Актуальныя праблемы вывучэння і выкладання гісторыі (для выкладчыкаў ВНУ) | 06.09–21.12 1 раз у тыдзень |
| Замежная мова (англійская мова) як аснова сацыяльнай дзелавой камунікацыі сучаснага спецыяліста (для ПВС і вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) | 10.09–16.11 2 разы ў тыдзень |
| Студэнцкая моладзь і здаровы лад жыцця (для куратараў студэнцкіх груп, спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) | 10.09–14.09 15.10–19.10 |
| Педагагічнае майстэрства выкладчыка: сутнасць, змест, сродкі фарміравання (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) | 10.09–21.09 10.12–21.12 |
| Выкарыстанне пакета Microsoft Office XP у вучэбным працэсе і навуковых даследаваннях (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) | 10.09–16.11 2 разы ў тыдзень |
| Эфектыўны маркетынг у вышэйшай школе (для прарэктараў ВНУ) | 17.09–22.09 |
| Прафілактыка асацыяльных з'яў у маладёжным асяродку (для кіраўнікоў грамадскіх арганізацый, устаноў адукацыі, сакратароў БРСМ і куратараў студэнцкіх груп) | 17.09–21.09 29.10–02.11 |
| Тэорыя і методыка навучання гісторыі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ,СШ) | 17.09–28.09 |
| Прыродазнаўства: экалагічны аспект (для выкладчыкаў ВНУ) | 01.10–05.10 19.11–23.11 |
| Кіраванне кафедрай у сістэме вышэйшай адукацыі (для загадчыкаў кафедраў, рэзерву загадчыкаў кафедраў) | 01.10–06.10 29.10–03.11 |
| Філасофія і метадалогія навукі: тэорыя і методыка выкладання магістрантам і аспірантам (для выкладчыкаў ВНУ) | 01.10–13.10 |
| Метадычная служба ў сістэме вышэйшай адукацыі (для метадыстаў ВНУ і ўстаноў СПК) | 08.10–12.10 |
| Праблемы міждысцыплінарнага сінтэзу ведаў у сістэме універсітэцкай падрыхтоўкі (для выкладчыкаў ВНУ) | 15.10–27.10 |
| Ахова працы ў арганізацыі навучальнага працэсу (для загадчыкаў лабараторый, майстэрняў навучальных устаноў) | 22.10–26.10 |
| Арганізацыя сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы ва ўстановах адукацыі (для выкладчыкаў) | 22.10–02.11 |
| Метадалогія і методыка дысертацыйных даследаванняў (для маладых выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў ВНУ) | 12.11–24.11 |
| Этнічная і канфесіянальная гісторыя Беларусі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) | 26.11–07.12 |
| Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы ў кантэкстце курса інавацыйнага развіцця (для выкладчыкаў ВНУ) | 26.11–08.12 |

### НА ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ З ПРЫСВАЕННЕМ КВАЛІФІКАЦЫІ:

| | |
|---|---|
| Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін | 10.09.07–06.12.08 вочна |
| Спецыяліст па педагагічных вымярэннях | 10.09.07–27.06.08 вочна |
| Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі | 01.10.07–28.03.09 вочна па этапах |
| Менеджэр-эканаміст | 01.10.07–24.04.09 завочна |
| Спецыяліст па рабоце з моладдзю | 08.10.07–20.12.08 вочна па этапах |
| Выкладчык вышэйшай школы | 05.11.07–25.04.09 вочна па этапах |

**Тэлефоны для папярэдняга запісу ў групы: 222-83-03, 200-20-47.**

**Наш адрас: 220007 г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 320, тэл/факс 200-25-51.**

АФІЦЫЙНА

# БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ НА 2007 ГОД

### З адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

**Механіка-матэматычны факультэт:** матэматычны аналіз; дыферэнцыяльныя ўраўненні; геаметрыя і тапалогія; матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў; вылічальная матэматыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; механіка дэфармаванага цвёрдага цела; механіка вадкасці, газу і плазмы.

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:** дыферэнцыяльныя ўраўненні; тэорыя імавернасці і матэматычная статыстыка; дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка; матэматычнае і праграмнае забеспячэнне ВМ і камп'ютарных сетак; тэарэтычныя асновы інфарматыкі; матэматычнае мадэляванне, лікавыя метады і комплексы праграм; метады і сістэмы абароны інфармацыі.

**Фізічны факультэт:** тэарэтычная фізіка; оптыка; фізіка кандэнсаванага стану; фізіка паўправаднікоў; лазерная фізіка; біяфізіка; аптычныя і оптаэлектронныя прыборы і комплексы; цеплафізіка і тэарэтычная цеплафізіка; фізіка ядра і элементарных часціц.

**Факультэт радыёфізікі і электронікі:** прыборы і метады эксперыментальнай фізікі; фізічная электроніка; фізіка плазмы; інфармацыйна-вымяральныя і кіруючыя сістэмы; сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі; элементы і прылады ВТ і сістэм кіравання; цвердацельная мікра- і нанаэлектроніка; радыёфізіка.

**Хімічны факультэт:** аналітычная хімія; арганічная хімія; хімія высокіх энергій; хімія цвёрдага цела.

**Біялагічны факультэт:** біяхімія; батаніка; мікрабіялогія; заалогія; фізіялогія і біяхімія раслін; фізіялогія; генетыка; гідрабіялогія; біятэхналогія.

**Гістарычны факультэт:** айчынная гісторыя; усеагульная гісторыя; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання; археалогія; этнаграфія і этналогія.

**Факультэт міжнародных адносін:** гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; сусветная эканоміка; тэорыя мовы; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права, еўрапейскае права; палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі.

**Эканамічны факультэт:** эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай; матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук:** анталогія і тэорыя пазнання; гісторыя філасофіі; сацыяльная філасофія; рэлігіязнаўства, філасофская антрапалогія, філасофія культуры; агульная псіхалогія, псіхалогія асобы, гісторыя псіхалогіі; сацыяльная псіхалогія; медыцынская псіхалогія; педагагічная псіхалогія; тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі; сацыялогія кіравання; этыка.

**Філалагічны факультэт:** беларуская літаратура; тэорыя літаратуры, тэксталогія; тэорыя мовы; славянскія мовы.

**Факультэт журналістыкі:** журналістыка.

**Юрыдычны факультэт:** тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння; прыродарэсурснае права, аграрнае права, экалагічнае права; крымінальны працэс, крыміналістыка; адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права; тэорыя палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі; палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі; палітычныя праблемы міжнародных адносін; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; грамадзянскі працэс; канстытуцыйнае права, муніцыпальнае права.

**Геаграфічны факультэт:** агульная і рэгіянальная геалогія; фізічная геаграфія і біягеаграфія; эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія; геаэкалогія.

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі:** агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.



### Без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:** тэарэтычныя асновы інфарматыкі; метады і сістэмы аховы інфармацыі, інфармацыйная бяспека.

**Фізічны факультэт:** лазерная фізіка.

**Факультэт радыёфізікі і электронікі:** сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі.

**Біялагічны факультэт:** біяхімія.

**Гістарычны факультэт:** айчынная гісторыя; гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

**Факультэт міжнародных адносін:** гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права; міжнароднае права, еўрапейскае права; сусветная эканоміка; тэорыя мовы.

**Эканамічны факультэт:** эканамічная тэорыя; эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай.

**Філалагічны факультэт:** літаратура народаў краін замежжа (англійская).

**Факультэт журналістыкі:** журналістыка.

**Юрыдычны факультэт:** адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права; грамадзянскае права, прадпрымальніцкае права, сямейнае права, міжнароднае прыватнае права.

**Геаграфічны факультэт:** фізічная геаграфія, біягеаграфія; геаэкалогія.

**Кафедра фізвыхавання:** тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры.

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі:** тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах).

Навучанне ў аспірантуры вядзецца на кантрактных умовах.

У аспірантуру з адрывам і без адрыву ад вытворчасці прымаюцца асобы, якія маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі (за выключэннем дыплома бакалаўра) і (ці) дыплом магістра, схільнасць да навуковых даследаванняў, што пацвярджаецца навуковымі публікацыямі, удзелам у навукова-даследчых і інавацыйных праектах, навукова-практычных канферэнцыях, семінарах і іншымі матэрыяламі. Тыя, хто паступае, павінны мець вопыт практычнай работы не менш за два гады альбо рэкамендацыю Вучонага савета ці факультэта ВНУ.

У аспірантуру без адрыву ад вытворчасці прымаюцца асобы, якія працуюць у БДУ.

У аспірантуру па спецыяльнасцях педагагічнай галіны прымаюцца асобы, якія маюць стаж работы па спецыяльнасці ў сферы адукацыі не менш за 2 гады.

Асобы, якія раней прайшлі аспіранцкую падрыхтоўку ў межах вызначанага тэрміну ці поўны курс знаходжання ў якасці суісканьніка вучонай ступені, не маюць права паўторнага навучання ў аспірантуры за кошт бюджэтных сродкаў.

Тыя, хто паступае ў аспірантуру, здаюць уступныя экзамены па спецыяльнасці, замежнай мове і філасофіі ў аб'ёме дзеючых праграм для вышэйшых навучальных устаноў. З праграмамі можна азнаёміцца на адпаведных кафедрах. Уступны экзамен па спецыяльнасці папярэднічае экзаменам па іншых дысцыплінах. Пераздача ўступных экзаменаў не дапускаецца.

Ацэнка ведаў тых, хто паступае, ажыццяўляецца па пяцібальнай шкале.

Асобы, якія здалі цалкам ці часткова кандыдацкія экзамены згодна з вызначанымі патрабаваннямі, вызваляюцца ад адпаведных уступных экзаменаў і карыстаюцца пераважным правам залічэння ў аспірантуру па конкурсе. **Здача ўступнага экзамену па спецыяльнасці пры прыёме ў аспірантуру абавязковая.**

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць на імя рэктара універсітэта **заяву вызначанага ўзору** і дадаюць **наступныя дакументы:**

- асабісты лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і 2 фатаграфіі (фатаграфіі павінны быць наклеены на асабісты лісток па ўліку кадраў і на экзаменацыйны ліст);
- медыцынская даведка па форме, вызначанай Міністэрствам аховы здароўя для тых, хто паступае ў ВНУ;
- спіс і копіі апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў, патэнтаў і спіс справаздач пра выкананыя даследаванні і распрацоўкі; асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых работ, вынаходніцтваў і патэнтаў, прадстаўляюць навуковыя даклады (рэфераты) па выбранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. Навуковыя работы ці рэферат рэцэнзуюцца меркаваным навуковым кіраўніком з выстаўленнем адзнакі на адваротным баку экзаменацыйнага ліста;
- копіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіскі з заліковай ведамасці;
- ксеракопію працоўнай кніжкі (для працуючых) ці рэкамендацыю Савета факультэта ВНУ. У рэкамендацыі Вучонага савета факультэта ВНУ павінна ўказвацца тэма дыпломнай работы ці магістэрскай дысертацыі, а таксама адлюстроўвацца ўдзел рэкамендаванага ў навукова-практычных канферэнцыях, семінарах, наяўнасць у яго публікацый (артыкулаў, дакладаў), патэнтаў на вынаходніцтвы, грантаў, імянных стыпендый;
- ксеракопію пашпарта (с.1, 31, 32, 33);
- два канверты з зваротным адрасам (для іншагародніх);
- хуткасшывальнік (кардонны);
- копіі дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў (пры наяўнасці ў паступаючых у аспірантуру здадзеных кандыдацкіх экзаменаў).

Пашпарт, арыгіналы дыплома аб заканчэнні ВНУ і дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў прад'яўляюцца асабіста.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру па накіраваннях арганізацый, прадстаўляюць дадаткова накіраванні арганізацый.

**Прыём у аспірантуру з 1 ліпеня па 15 верасня 2007 года.**

Уступныя экзамены праводзяцца з 25 верасня па 18 кастрычніка 2007 г.

**Залічэнне ў аспірантуру з 1 лістапада.**

Усім, хто паступае ў аспірантуру, перад першым уступным экзаменам па спецыяльнасці неабходна забраць у аддзеле аспірантуры экзаменацыйны ліст з пратаколам і пасля экзамену ў гэты ж дзень вярнуць іх у аддзел аспірантуры.

На наступныя экзамены (па замежнай мове і філасофіі) экзаменацыйныя лісты будуць накіроўвацца цэнтралізавана.

Усе, хто паступае ў аспірантуру, да 10 верасня павінны прайсці субяседаванне з загадчыкамі кафедраў і меркаванымі навуковымі кіраўнікамі.

Асобам, дапушчаным да здачы ўступных экзаменаў у аспірантуру, паводле іх заявы наймальнік абавязаны даць адпачынак без захавання заработнай платы для падрыхтоўкі і здачы ўступных экзаменаў.

На падставе вынікаў уступных экзаменаў і з улікам наяўных вакантных месцаў на конкурснай аснове прыёмная камісія выносіць рашэнне аб залічэнні ў аспірантуру асоб, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены.

Аспірантам, якія навучаюцца з адрывам ад вытворчасці, у вызначаным парадку выплачваецца стыпендыя.

Тэрмін навучання ў аспірантуры з адрывам ад вытворчасці – 3 гады, без адрыву ад вытворчасці – 4 гады.

Іншагароднім прадстаўляецца інтэрнат (без сям'і).

Выпускнікі магістратуры 2007 г. здаюць усе ўказаныя вышэй дакументы ў вызначаны тэрмін (да 10 верасня). Копіі дыплома магістра, дадатак да дыплома і рэкамендацыю Савета факультэта ў аспірантуру пасля заканчэння магістратуры прадстаўляюць не пазней 1 кастрычніка гэтага года.

**Дакументы накіроўваць на адрас: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, БДУ, аддзел аспірантуры, тэл. 209-54-23, 209-51-73.**

Гэтыя ўмовы супрацоўнікі і студэнты БДУ могуць таксама атрымаць праз любую праграму, якая працуе з электроннай поштай (напрыклад, Microsoft Outlook). Для гэтага неабходна ў меню Від-Спіс папак адкрыць Агульныя папкі – Усе агульныя папкі – Галоўнае ўпраўленне навукі – Аддзел аспірантуры.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

15 чэрвеня 2007 года
Падпісана да друку 13.06.2007 г.
Зак. 627. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by